

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*С.А.ПАЦЫЕНКА*

## СЯРЭДНЕВЯКОВЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ЗАМКІ І ІХ ЖЫХАРЫ

Замкі — сімвалы гісторыі Беларусі. Крывавыя міжусобіцы літоўскіх князёў і бесперапынныя войны з крыжаносцаміператварылі Вялікае княства Літоўскае ў ваенны лагер, дзе законнасць улады была заснавана на сіле і зброі. Гэтыя прычыны прымусілі літоўскіх князёў «абносіць свае збудаванні магутнымі сценамі, прыстасаванымі да абароны, не столькі супраць ворага знешняга, але часта і супраць бліжэйшага сваяка» [2].

Першапачаткова ў замках жыла галоўным чынам вайсковая арыстакратыя, што дыктавалася ўмовамі пастаяннай агрэсіі. У сярэднявеччы «трываласць вярхоўнай улады была заснавана на большай ці меншай вайсковай сіле і на асабістых якасцях князя» [2]. Кодэкс гонару беларускага шляхціца канца XIV ст. быў адпаведны: «Рыцар павінен быць хрысціянінам, мець генеалагічнае дрэва, паводзіць сябе прыстойна… Быць ад нараджэння смелым і ахвочым да бою, мужным, устрыманым у ежы і піцці…памятаць аб сваім гонары і гонары таварышаў…Рыцар, чалавек, якому даверана зброя, павінен паступаць добра і разумна» [3].

Традыцыйна ў замках жылі вялікія літоўскія князі. Усе замкі Вялікага княства Літоўскага падзяляліся на агульнадзяржаўныя і прыватнаўласніцкія. Агульнадзяржаўныя, ці вялікакняжацкія, замкі ўтрымліваліся за кошт дзяржавы. Іх будаўніцтва было пашырана ў канцы XIII – пачатку XV ст. Размяшчаліся такія замкі ў стратэгічна важных рэгіёнах краіны і мелі агульнадзяржаўнае прызначэнне. Да іх ліку адносіліся замкі ў Навагрудку, Вільні, Троках, Гродне, Лідзе, Крэве.

Асноўнай задачай жыхароў замка было выжыць і абараніць сябе. Тэхнічныя і людскія рэсурсы былі падпарадкаваны функцыі абароны. Эканомія сродкаў, разумнае выкарыстанне запасаў, дакладнае веданне і выкананне сваіх абавязкаў – такімі былі ўмовы выжывання ў замках агульнадзяржаўнага прызначэння.

Сярэдневяковыя беларускія замкі ўяўлялі замкнёную самадастатковую прастору. Кожны замак меў сістэму ўмацаванняў і парадак абароны на выпадак варожага нашэсця. Усе духоўныя і гаспадарчыя патрэбы жыхароў замкаў можна было задаволіць, не пакідаючы замкавых муроў.

На тэрыторыі кожнага замка абавязкова мелася студня, якая забяспечвала насельніцтва пітной вадой. Наяўнасць вады была адной з неабходных умоў для жыцця, асабліва ў цяжкія часы аблогі, калі сувязь з навакольным асяроддзем была цалкам або часткова спынена. Праблема водазабеспячэння ў замках вырашалася па-рознаму. Найчасцей на замкавым двары выкопвалася глыбокая студня. Аднак гэта больш характэрна для нізінных замкаў. Будаўнікі замкаў, якія размяшчаліся на ўзвышшах, выкарыстоўвалі іншыя магчымасці. Напрыклад, для забеспячэння вадой жыхароў замка ў Навагрудку прыйшлося пабудаваць дадатковую вежу — калодзежную. Сам замак размяшчаўся на высокай гары, на ўсходнім схіле якой білі моцныя крыніцы. Таму ля падэшвы гары была пабудавана яшчэ адна вежа, яе злучылі з замкам сцяной. У сярэдзіне гэтай сцяны быў патаемны праход да вады [4].

Неабходным элементам замкавай прасторы была наяўнасць спецыяльнага месца для спраўлення набажэнстваў. Вялікая набожнасць людзей сярэднявечча не падлягае сумненню. Чалавек тых часоў жыў пад пастаянным "нябесным" кантролем. Зварот да Бога як да галоўнага збавіцеля і выратавальніка ў самыя цяжкія часы штурмаў і аблог з’яўляўся адзіным паратункам. Менавіта таму ў кожным замку абавязкова была царква ці касцёл. Нават калі замкі перасталі выконваць чыста абарончую функцыю, культавае будаўніцтва на замкавых тэрыторыях па-ранейшаму працягвалася.

У замку абавязкова меўся склеп-вязніца, дзе ўтрымліваліся злачынцы. Часам турма размяшчалася ва ўязной вежы-браме і мела надземную і падземную часткі. Небяспечных злачынцаў трымалі ў ніжняй частцы (глыбінёй да 12 локцяў), дзе не было акон і печы для ацяплення. Паводле Статута 1588 г. замкавыя вежы-вязніцы павінны былі замыкацца і мець надзейную варту. За будаўніцтва і ўтрыманне ў іх зняволеных адказвалі ваяводы і старосты:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Прото для лепшое опатрности мають воеводове, старостове везде в замкох…казати побудовати вежы моцные и глубокие по шести сажон в земли, и при том иншие, не в земли, лжейшое везенье, але предсе за замкненьем и добрим моцным обварованьем, мети» [3].

Будаўніцтва дзяржаўных замкаў у Вялікім княстве Літоўскім працягвалася прыкладна да пачатку XV ст. Пасля перамогі саюзнага войска ў Грунвальдскай бітве ў 1410 г. беларускія гарады не адчувалі непасрэднай ваеннай пагрозы і маглі свабодна развівацца. Узмацнілася эканамічная магутнасць тутэйшых магнатаў, што валодалі велізарнымі латыфундыямі і дзесяткамі тысяч сялян. У выніку гэтага ў пачатку XV ст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага пачалося актыўнае будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў – рэзідэнцый феадалаў. Так узніклі замак Ільінічаў у Міры, замак Храптовічаў у Любчы, замак Радзівілаў у Нясвіжы, замак Глябовічаў у Заслаўі і інш. З пашырэннем будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў агульнадзяржаўныя замкі паступова згубілі сваё былое значэнне і пачалі прыходзіць у заняпад.


*1. Килбас А.А.* Культура привилегированного сословия на территории Беларуси в XIV – XVIвв.// Вестник Белорусского государственного университета. Сер. 3. — 1998. — № 2. — С. 4.

*2. Материалы* для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба. Виленская губерния. — СПб.: Б. и., 1861. – С. 792.

*4. Ткачоў М.А.* Замкі Беларусі. — Мн.: Полымя, 1977. — С. 19.

*5. Статут* Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / Рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989 (раздз. 4, арт. 31).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ